УДК 811.161.3’373:821.161.3(045)

**С. А. Сігаева** (Мінск)

# АРХЕТЫП ДРЭВА І ЯГО МАСТАЦКАЕ АСЭНСАВАННЕ Ў ТВОРЧАСЦІ ЯКУБА КОЛАСА

Абагаўленне дрэва, якое ўзнікла ў свядомаці нашых продкаў многія тысячагоддзі назад, вызначыла сабою структуру ўсіх міфалагічных сістэм. Дзякуючы гэтаму вобразу, вобразу Сусветнага Дрэва, чалавек убачыў свет як адзінае цэлае. Артэфакт Касмічнага дрэва паступова стаў важнейшым сімвалам культуры. Адасобіўшыся ад першастваральнага хаасу, вылучыўшыся з яго, дрэва стала, бадай, непасрэдным матэрыялам для стварэння космасу, ці нават самім космасам. На яго, як на ўжо створыўшуюся своеасаблівую вось, пачалі нанізвацца разнастайныя элементы свету ад багоў і жывёлін да абстрактных алегорый, напрыклад, часавых.

*Дрэва Сусвету* – характэрны для міфалагічнай свядомасці вобраз, які засведчаны практычна паўсюдна – ці ў «чыстым» выглядзе, ці ў розных, нават нечаканых, варыянтах: Дрэва Жыцця, Дрэва Урадлівасці, Дрэва Ведаў, Дрэва Кахання, Дрэва Цэнтру, Дрэва Узыходу, Нябеснае Дрэва, Дрэва Апраметнай і г.д. Сустракаюцца і найбольш рэдкія назвы: Дрэва Смерці, Дрэва падземнага царства і іншыя.

Вобраз Сусветнага Дрэва выяўлены на аснове міфалагічных, у прыватнасці касмаганічных уяўленняў, зафіксаваных у паэтычных тэкстах самых розных жанраў, помніках выяўленчага мастацтва, архітэктурных збудаваннях, рэчах хатняга ўжытку. У часавай прасторы гэты вобраз расцягнуты ад эпохі бронзавага стагоддзя і ажно да нашых дзён.

Паводле шматлікіх вусна-паэтычных прыкладаў з жыцця розных індаеўрапейскіх народаў, якія жылі ў лесе, цэнтрам свету, воссю свету, было *Прадрэва* або *Касмічнае Дрэва*, якое злучала цэнтр Пекла, цэнтр Зямлі, цэнтр Неба. Дрэва мадэлюе свет і па гарызанталі, па вертыкалі, і ў часавых адносінах. Прадрэва злучала тры сферы: карэнні яго ў падзем'і, камель – на зямлі, карона – у небе. Вобраз дрэва вызначаў для чалавека яго месца ў космасе. Дрэва – брат чалавека ў прасторы паміж Небам і Зямлёй.

Дрэва – адно з самых высакародных стварэнняў Маці-Прыроды, якая гэтым як бы паказвае пажаданую форму чалавечай душы: форму, якая дазваляе, трывала трымаючыся за зямлю, абавязкова родную, смела ўздымацца ў неба. Дрэва ўяўляе сабой вялікі вобраз імкнення да ідэалу, да Сонца, да Бога.

Дрэва – брат чалавека не толькі ў прасторы, але і ў часе. Нашы продкі жылі ў цыклічным часе, з надзеяй на вечны кругазварот пераўтварэнняў, на адраджэнне, падобнае таму, што і дрэва адраджаецца кожнай вясной пасля зімняга паміранця.

Патрэбна адзначыць, што вертыкальная структура Прадрэва, якая складалася з трох узроўняў, або касмічных зонаў (ніжняга – карані, сярэдняга – камель, верхняга – голле), мае здвоеныя супрацьлегласці гэтым зонам або бінарныя апазіцыі: Зямля – Неба, Зямля – Апраметная, Агонь (сухое) – Вільгаць (мокрае), Мінулае – Сённяшняе, Сённяшняе – Будучае, Дзень – Ноч і г.д.

Пары гэтыя перамяшаліся ў структуры дрэва з траістымі адзіноцтвамі: мінулае – сапраўднае – будучае; продкі – сучаснікі – нашчадкі; тры часткі цела: галава, тулава, ногі; тры стыхіі: агонь, зямля, вада. Усе пары і тройкі адлюстроўвалі самыя розныя сферы жыцця – анатамічную, часавую, прычынна-выніковую. Людзі паступова разумелі ўзаемасувязь супрацьлегласцей.

Шэраг фактараў сведчаць пра тое, што вобраз Дрэва Сусвету суаднесены з агульнай мадэллю шлюбных адносін і, калі глядзець значна шырэй, з пераемнай сувяззю пакаленняў, якая адлюстроўвалася пры дапамозе генеалагічных дрэў.

Такім чынам, вертыкальная структура дрэва больш звязана з касмалогіяй, у той час як гарызантальная – з рознымі магічнымі рытуаламі. Гарызантальная структура Дрэва Сусвету ўтвараецца самім дрэвам і выявамі па яго баках, імі могуць быць жывёлы або людзі. Гэтыя кампазіцыі даволі часта выступаюць у больш позні перыяд, асабліва ў творах хрысціянскага і будзійскага мастацтваў. Абавязковай умовай з'яўляецца тое, што аб'ект рытуала ці яго вобраз заўсёды знаходзіцца ў цэнтры, а ўдзельнікі – злева і справа. Уся гэтая паслядоўнасць элементаў па гарызанталі ўспрымаецца як рытуальная сцэна, асноўная мэта якой – забеспячэнне дабрабыту, урадлівасці, спадчыннасці.

У дрэве нярэдка намаляваны восем галінак – па чатыры з кожнага боку. Чатыры галінкі – гэга і чатыры бакі свету, і чатыры асноўныя колеры, якія найчасцей сустракаюцца ў прыродзе: чырвоны, сіні, чорны і белы.

Няма нічога дзіўнага, што дрэва гэтак трывала ўвайшло ў нашу генетычную памяць. Псіхолагі зараз даказваюць, што на пэўным этапе развіцця дзіцячай псіхікі яно выяўляецца як першасны вобраз, у малюнках дзіцяці дрэва значна пераболышвае.

Яшчэ можна адзначыць, што гарызантальная структура схемы Дрэва Сусвету мадэлюе не толькі лічбавыя адносіны і бакі свету, але і поры года, гадзіны сутак, якіх таксама чатыры – раніца, дзень, вечар, ноч. Увесь свет, які ўжо зведаны чалавекам і які яшчэ ўвогуле не спазнаны, прыводзяць да нейкай

пэўнай сістэмы міфапаэтычнай канстанты дрэва – магічныя лічбы. Двойка, як тлумачаць этнографы, валодае бінарнымі супрацьлегласцямі (яны згаданы вышэй). Тройка, якая выходзіць з падзелу самога дрэва па вертыкалі на тры часткі, увасабляе абсалютную дасканаласць і невычарпальнасць. Адсюль хрысціянская Троіца, тры сыны ў казцы, тры сацыяльныя групы ў любым грамадстве, тры спробы ва ўсялякай справе, – ад казачнага дзеяння да самай сучаснай спартыўнай гульні. Сімвал усяго гэтага – узнікненне, развіццё і завяршэнне.

Асаблівая роля Дрэва Свету для міфапаэтычнай эпохі вызначаецца тым, што яно выступае як непасрэднае звяно паміж сусветам (макракосмасам) і чалавекам (мікракосмасам) і з'яўляецца месцам іх перасячэння. Гэта гарантавала цэласны погляд на свет, вызначала месца чалавека ўвогуле і кожнага чалавека ў прыватнасці ў агромністым свеце. У культурным развіцці чалавецтва канцэпцыя Сусветнага дрэва пакінула пра сябе сляды ў шматлікіх касмалагічных, рэлігійных і міфалагічных уяўленнях, адлюстраваных у мове, моўных тэкстах розных накірункаў, рытуалах, мастацтве, архітэктуры, паэтычных вобразах і г.д.

З імем Якуба Коласа звязаны здабыткі нацыянальскай пейзажная лірыкі пачатку ХХ стагоддзя. Паэтычнае Коласава бачанне абапіралася на з'явы звычайнага, будзённага жыцця навакольнага свету і штораз пранікала глыбей у таямніцы гэтага жыцця – так, як дапытлівы розум і чуйная душа адкрываюць неспазнаны чалавечы свет.

Для чалавека, усё жыццё якога праходзіла на ўлонні прыроды і было ўключана ў адвечны кругабег яго існавання – праз будзённую сялянскую працу, праз святочную традыцыю рытуалу, абраду, – з першых год дзяцінства найбліжэйшы лес станавіўся родным домам. Паступова ў ім адчувалася ўсё да драбніц, але мова гэтага лесу, яго жывы, зменлівы голас-шум непакоілі душу чалавека, будзілі яго фантазію, імкненне разгадаць патаемны сэнс жыцця.

Невыпадкова ўсе творы Коласа, у якіх распрацаваны матыў своеасаблівага дыялога чалавека і прыроды, прасякнуты глыбокім філасофскім асэнсаваннем жыцця.

Прыродзе надаецца своеасаблівая роля, яна выступае як неад'емны кампанент твораў. Пейзаж адыгрывае выключна важную ролю ў коласаўскай канцэпцыі свету, меншую – у канцэпцыі чалавека. Пейзажы, заўсёды паэтычныя, поўныя багатага духоўнага зместу, як бы ўзнімалі рэальны бытавы і сацыяльны свет, у якм існавалі, дзейнічалі персанажы, свет амаль заўсёды цяжкі, супярэчлівы, нагадвалі яму іншыя вымярэнні, больш шырокую перспектыву, больш светлае гучанне. Адсюль характары, дзякуючы пейзажным карцінам, духоўна таксама паглыбляліся, эмацыянальна ўзбагачаліся. Прырода для коласаўскага героя як бы «сховішча» ад рэальных цяжкасцей жыцця, ад нягод і нястач.

Гаворачы пра артэфакт дрэва ў творах Я. Коласа, нельга не закрануць вобраз лесу, які заусёды цудоўна апаэтызаваны ў яго творах. У сваёй паэме «Суд у лесе» Я. Колас з натхненнем выказвае сваё асабістае стаўленне да лесу:

*Люблю я лес, адвечны бор,*
*Дзе узносяць хвоі ўгору шапкі,*
*Дзе рассцілаюць елі лапкі*
*І востры верх імкнуць у прастор* [1, т. 6, с 102].

Пры апісанні лесу аўтар узгадвае ўсе састаўныя і неад'емныя часткі яго, гэта значыць у першую чаргу дрэвы, кусты, імхі, жывёлы і нават... баравікі, якія ён вельмі любіў збіраць.

Традыцыйныя ў фальклоры вобразы-сімвалы дубоў, якія нагадваюць пра свяшчэнныя дрэвы часоў паганства, даволі часта выступаюць на першы план. Дуб у Я. Коласа – гэта ўвасабленне Прадрэва.

Адной з крыніц вобразнасці паэмы «Новая зямля» з'яўляецца адлюстраванне паганскіх анімістычных і антрапамарфічных уяўленняў нашых продкаў:

*І соку кропелькі, як слёзы,*
*Як град пасыпаліся з бярозы,*
*Аж шкода нейк было дзярвякі:*
*Здаваліся ранай тыя знакі,*
*Адкуль паліўся сок халодны*
*І пакідаў свой камель родны* [1, т. 6, с. 58].

Падобныя вобразы ў Коласа маюць не толькі адбітак філасофскай развагі, але і глыбокі псіхалагічны змест, тут ёсць пранікненне ў своеасаблівую псіхалогію адухоўленай прыроды. Асаблівую ўвагу пісьменніка прыцягвае воблік адзінокага дрэва, які з найбольшай сілай і паўнатой дазваляе раскрыць унутраны стан героя.

Паэтычна сэнсоўнай формулай дыялектыкі жыцця, услаўленнем непарыўнай сувязі таго, што можна назваць асобай, сталі афарыстычныя словы Коласа, сказаныя ў паэме «Рыбакова хата»:

*Пытае бура старца дуба:*
*Чаму цябе я не зламлю?*
*І кажа дуб: – Я ўрос у зямлю,*
*З зямлёю жыць у дружбе люба* [1, т. 7, с. 216].

Гэтай ідэяй, па сутнасці, акрэслены цэлая філасофія жыцця, якую Я. Колас настойліва і паслядоўна выказаў у многіх творах.

У Я. Коласа ёсць шэраг асобных вершаў, якія ён прысвячае магутнаму дрэву, дзе найбольш поўна раскрываецца гэты вобраз і на прыкладзе якога можна прасачыць само разуменне і ўспрыманне Коласам дрэва. Пачынаецца верш «Дуб» з агульнага апісання ўспрыняцця дуба, вылучэння яго. Паэт падкрэслівае, што нельга не заўважыць такога асілка:

*Сілачом стаіць*
*Дуб разложысты,*
*І з далёк відаць*
*Пышны верх яго* [1, т. 14, с. 211].

Далей Колас падмацоўвае веліч дрэва наступнымі радкамі:

*А ў нізе пад ім Неман коціцца,*
*Срэбрам-стужкаю павіваецца.*
*У нагах трава*
*Нізка сцелецца...*

Аўтар, як і пры апісанні дуба ў некаторых «Казках жыцця», зноў звяртаецца да спробы перадаць моц і веліч дрэва, яго непахіснасць і трываласць:

*У глыб зямлі ўвайшлі*
*Карані яго,*
*Крэпка дуб стаіць,*
*Не варушыцца!*

Моц дрэва падкрэсліваецца пры апісанні яго асобных частак:

*Так размашыста*
*Раскіданы*

*Ва ўсе стораны*
*Лапы крэпкія.*
*Комель – слуп-скала*
*Дыша сілаю,*
*А ўгару зірнеш –*
*Шапка валіцца.*

Потым аўтар, прызнаючы веліч і сілу магутнага дрэва, гарманічна прыбаўляе да яго апісання:

*Дуж ты, дуб стары,*
*Сын вякоў сівых!..*

У наступных радках Колас як бы па-чалавечы спачувальна адносіцца да яго:

*Многа бур ты знёс*
*На вяку сваім!*

Думкі самога Коласа, яго разважанні аб жыцці перадае дрэва: «Чым цікава гэтае жыццё, – сказаў адзін дуб, ды гэта тым, што яно хоць і ідзе па пэўных законах, але вечна змяняецца і разгортвае новыя старонкі. І колькі б ты ні жыў, ніколі не пасягнеш яго мнагамернасці» («Купальскія светлякі») [1, т. 5, с. 50].

Дрэва – увасоблены ідэал дынамічнай раўнавагі гарызантальнага і вертыкальнага, глебы, у якую ўваходзіць каранямі, і неба, да якога цягнецца вяршыняю.

У фальклоры замацаваліся ўстойлівыя вобразы-сімвалы: бяроза сімвал вернасці, яблыня – цвёрдасці, дуб – мудрасці і сілы, сасна – мужнасці, елка – цярпення.

Літаратура – гэта верхні паверх нацыянальнага логасу, яна не так набліжана да космасу, як, напрыклад, вусная народная творчасць, бо аўтары абапіраюцца не толькі на нацыянальнае, але і на інтэрнацыянальнае.

Своеасаблівым мостам паміж старажытнымі архетыпамі і людзьмі выступаюць сімвалы, што адкрываюць чалавеку сакральнае, кампенсуюць адарванасць ад прыроды. Мастак, выкарыстоўваючы тыя ці іншыя артэфакты і сімвалы, абапіраецца на міфалогію, вусную народную творчасць і спрадвечную культуру. Вывучаючы творы мастацкай літаратуры ў адносінах вобразнасці, характараў, ужываемых мастацкіх сродкаў, мы спасцігаем веды пра народнае светаадчуванне ў цэлым.

ЛІТАРАТУРА

1. *Колас, Я.* Збор твораў у 14 т. / Я. Колас. – Мінск : Народная асвета, 1975. – 14 т.